УДК 372.881.1

# ПАШЫРЭННЕ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭЛЕКТ-КАРТ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

**Гумен Валерыя Аляксандраўна**
настаўнік пачатковых классаў
дзяржаўнай установы адукацыі "Пачатковая школа № 1 г. Брэста"
(г. Брэст, Рэспубліка Беларусь)

**Анатацыя.** У артыкуле асветлена праблема пашырэння слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў, а таксама адно з рашэнняў гэтай поблемы - интелект-карта.

**Ключавыя словы**: беларуская мова, літаратурнае чытанне, інтэлект-карта.

На працягу педагагічных практык, а таксама падчас непасрэднай працы ў школе, мы сутыкнуліся з праблемай: сёння дзеці з цяжкасцю асвойваюць беларускую мову. Кожны ўрок беларускай мовы для іх выпрабаванне, якое адбываецца па алгарытме "хутчэй бы прайшлі гэтыя 45 хвілін". Іх гаворка складаецца больш з рускіх слоў, чым з беларускіх. У дзяцей няма зацікаўленасці ў роднай мове, як і ў пашырэнні слоўнікавага запасу. Праца з тэкстам на беларускай мове адбываецца такім жа чынам: з вялікім нежаданнем і знішчальным матывацыю неразуменнем.

Праз некалькі ўрокаў прыйшла думка: цалкам пераходзіць на беларускую нельга, інакш гэта створыць умовы, якія адштурхнуць дзяцей яшчэ больш. Тады мы вырашылі паспрабаваць іншае: паставіць дзяцей ва ўмовы, калі ім неабходна будзе размаўляць, пісаць і чытаць на беларускай мове, але пры гэтым будуць выкарыстоўвацца словы, якія яны ўжо ведаюць. У гэтым нам дапамагла інтэлект-карта.

Інтэлект-карта (або ментальная карта) – гэта графічнае прадстаўленне інфармацыі, якое дапамагае структураваць і арганізаваць думкі і ідэі. Яна ўяўляе сабой дыяграму, дзе цэнтральная тэма або ідэя размяшчаецца ў цэнтры, а ад яе адыходзяць галіны, якія ўтрымліваюць звязаныя паняцці, падтэмы або падрабязнасці.

Стварэнне інтэлект-карты звычайна пачынаецца з напісання цэнтральнай ідэі або тэмы ў цэнтры карткі або ліста паперы. Затым вакол яе ствараюцца галіны, якія прадстаўляюць звязаныя з ёй паняцці. Розныя галіны могуць быць каляровымі або маркіраванымі для абазначэння розных катэгорый або узроўняў інфармацыі. На ўроках у пачатковай школе лепш за ўсё ўжываць наступныя віды інтэлект-карт [3]:

– "карта памяці" ўяўляе сабой інтэлект-карту, якая з'яўляецца адлюстраваннем працэсу мыслення, прымяняецца для развіцця творчых здольнасцяў; генеравання новых ідэй; збору і сістэматызацыі інфармацыі;

– "карта тэксту" з'яўляецца асноватворным метадам апрацоўкі і запамінання вялікіх аб'ёмаў тэкставай інфармацыі, развівае аналітычнае мысленне, дазваляе ўбачыць структуру тэксту і перабудаваць яе ў строгай лагічнай паслядоўнасці;

– “карта правіл” паскарае працэс запамінання правілаў і фарміраванне навыкаў іх практычнага прымянення.

Перавагі выкарыстання інтэлект-карт ўключаюць наступнае.

1. Візуальнае ўяўленне інфармацыі, што палягчае запамінанне і разуменне.

2. Магчымасць хуткага і навочнага выяўлення сувязяў і узаемасувязяў паміж рознымі элементамі.

3. Спрыянне творчага мыслення, паколькі інтэлект-карты дазваляюць свабодна асацыяваць ідэі і ствараць новыя канцэпцыі.

Алгарытм стварэння “інтэлект-карты” [1]:

1. Бярэм белы ліст фармату А4. Пачынаем стварэнне карты з цэнтра старонкі. Цэнтральны вобраз павінен быць самым яркім аб’ектам, таму што ён будзе з’яўляцца цэнтрам увагі. Ад яго будзем адыходзіць галіны-ідэі і дапаўненні.

2. Выкарыстоўваем толькі ключавыя словы або, там, дзе гэта магчыма, малюнкі.

3. Пішам друкаванымі літарамі. Гэта робіць вашу карту больш чытэльнай і запамінальнай.

4. Выкарыстоўваем колер, каб зрабіць тэмы і асацыяцыі больш яркімі.

5. Выкарыстоўваем стрэлкі, значкі, каб здацца сувязь паміж рознымі элементамі.

6. Пішам з верхняга правага кута і чытаем карту гэтак жа.

Выкарыстанне інтэлект-карт шматгранна. Іх можна выкарыстоўваць як пры вывучэнні часцін мовы, так і пры засваенні слоўнікавых слоў. Больш за тое, інтэлект-карты з’яўляюцца эфектыўным метадам пры працы з тэкстамі. Пры вывучэнні часцін мовы ў 4 класе у цэнтр карты ставіцца непасрэдна назва тэмы (часціны мовы), пасля чаго ад яе зыходзяць галінкі з наступнымі напрамкамі: на якія пытанні адказвае часціна мовы, што яна азначае, чым з’яўляецца ў сказе, прыклады. Такім чынам, дзеці ілюструюць правіла, запамінаюць яго, а таксама цалкам выкарыстоўваюць беларускія словы пры прэзентацыі сваёй працы.

Пры вывучэнні слоўнікавых слоў, прынцып працы падобны. У цэнтр ставіцца само слова, ад якога можна правесці наступныя напрамкі: словы-сінонімы, гука-літарны разбор слова, словы-асацыяцыі, якія дапамогуць у запамінанні месцаў з арфаграмай.

Праца з тэкстам становіцца больш займальнай пры выкарыстанні інтэлект-карт. Іх можна ўжыць пры складанні карткі персанажа: ад імя ставім галінкі з яго рысамі характару, учынкамі, якія пацвярджаюць гэтыя рысы, адносіны аўтара да персанажа, свае асабістыя адносіны да персанажа. Таксама эфектыўна ўжываць на этапе аналізу твора: асноўная ідэя, што хацеў сказаць аўтар, галоўныя персанажы, другарадныя персанажы і гэтак далей.

Дзецям таксама цікавей аналізаваць вершы, інтэлект-карта дапамагае лепш паглыбіцца ў сутнасць: асноўная думка верша, адносіны аўтара да апісанай ім з’явы / персанажа, якія часціны мовы выкарыстоўваюцца часцей за ўсё. Падчас складання інтэлект карт дзеці працуюць не самі, мэтазгодна арганізаваць працу ў групах. Такім чынам, яны не толькі знаходзяцца ва ўмовах вымушанага

выкарыстання беларускіх слоў, але і чуюць гэтыя словы, лепш запамінаюць, пашыраюць слоўнікавы запас.

У цэлым, інтэлект-карты – гэта выдатны інструмент для сістэматызацыі і арганізацыі інфармацыі пры вывучэнні беларускай мовы, які выконвае не толькі навучальныя задачы, але і дапамагае развіць творчае і асацыятыўнае мысленне малодшых школьнікаў.

## Спіс літаратуры

1. Бьюзен Т. Думайте эффективно / Т. Бьюзен // Минск : Попурри, 2006. – 104 с.

2. Новикова В.П. Интеллект-карта как эффективный инструмент рабоыт с художественным текстом. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/intellekt-karta-kak-effektivnyy-instrument-raboty-s-hudozhestvennym-tekstom/viewer. – Дата доступа: 10.02.2024.

3. Цишкевич А.И. Возможности использования интеллект-карт на уроках в начальной школе. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.cross-kpk.ru/documents/dal2018/%D0%A2%D0%BE%D0%BC_1.pdf#page=276. – Дата доступа: 12.02.2024.